На партыйных сходах

# НА ПАРАДКУ ДНЯ—СЕСІЯ!

На парадку дня адкрытага партыйнага сходу філалагічнага факультэта, які адбыўся нядаўна, стаяла пытанне аб падрыхтоўцы да зімняй экзаменацыйнай сесіі. Што ж, гэта зразумела. Пытанне аб сесіі—зараз самае надзённае: да яе засталіся лічаныя дні.

З дакладам выступіў намеснік дэкана Р. В. Булацкі. Ён адзначыў, што сёлета вучэбны год на факультэце пачаўся больш арганізавана, чым у мінулыя гады. Вучэбны працэс ідзе таксама больш паспяхова: паменшыўся лік пропускаў заняткаў, палепшыўся кантроль за якасцю лекцый. І ўсё ж на факультэце ёсць недахопы. За мінулы семестр рэдка праводзіліся адкрытыя лекцыі на некаторых кафедрах (рускай літаратуры і іншых) да гэтага часу яшчэ не разбіраліся і не абмяркоўваліся раней засценаграфаваныя лекцыі; на пятым курсе аддзялення журналістыкі многа пропускаў. Усё гэта можа даць свае адмоўныя вынікі ў час сесіі.

Сход прыняў канкрэтныя рашэнні па паляпшэнню падрыхтоўкі да сесіі. У гэтым годзе на факультэт прышло многа людзей з вытворчасці і з Савецкай арміі, якія маюць вялікі перапынак у вучобе. Ім трэба удзяляць як мага больш увагі і дапамогі, праводзіць з імі індывідуальныя кансультацыі.

Была прынята пастанова аб двухзменай рабоце кабінетаў у час сесіі; указана, каб факультэцкая насценгазета «Слова філолага» ўсебакова і сістэматычна асвятляла на сваіх старонках падрыхтоўку да сесіі і яе ход.

У спрэчках выступілі камуністы Паўленка, Пётух, Паіна і іншыя.

М. ШЫМАНСКІ

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 40 (390) | Субота, 19 снежня 1959 года. | Цана 10 кап.

ЧЫТАЙ СЁННЯ:

На парадку дня—сесія —1 стр.
Грамадскія навукі трэба вывучаць лепш —1 стр.
З сябрамі, роднымі і блізкімі вядзем сягоння перапіску мы —1 стр.
Ці варты тав. Клімовіч быць камуністам —2 стр.
Рамантыка рамантыцы розніца —2 стр.
Герой не нашага часу —2 стр.



ХУТКА ЭКЗАМЕНЫ... Фотаэцюд А. Шрубка.

# З сябрамі, роднымі і блізкімі вядзем сягоння перапіску мы...

Пісьмы... Іх многа прыносіць заўсёды заклапочаны паштальён у сваёй сумцы, напакаванай газетамі і часопісамі. Яны прыходзяць з розных куткоў краіны. Пішуць родныя, блізкія, сябры...

Але, бадай, ніводнае з іх не выклікала такой радасці, як гэтае — у светла-блакітным канверце з выразным штампам на ім «Міжнароднае». На месцы адваротнага адрасу значыцца:

«Патсдам алея Сталіна, 79.
Гюнтэр Гаазэ».

Гэта пісьмо ад нямецкіх сяброў. Яно мае сваю гісторыю, аб якой мне і хочацца зараз расказаць.

...Стаяў сонечны восеньскі дзень. Перон Мінскага вакзала перапоўнены. У руках сабраўшыхся — букеты кветак. З вуснаў кожнага ліліся незабыўныя, блізкія сэрцу словы: МІР! ДРУЖБА! ФРЫДЭН! ФРОЙНДШАФТ!

Гэта мінчане праводзілі нямецкіх сяброў, прыбыўшых у нашу сталіцу на некалькі дзён разам з «цягнікам дружбы».

Сярод праводзячых можна было бачыць і выкладчыцу нямецкай мовы універсітэта Берту Рыгораўну Шнэерсон. Гэта ёй адрасаваліся словы нямецкага юнака Гюнтэра Гаазэ:

— Мы будзем чакаць пісем ад вашых студэнтаў!

— Мы абавязкова напішам! — улавіў Гюнтэр яе голас сярод тысячы воклічаў...

Пасля таго, як пісьмо Гюнтэра было надрукавана ў шматтыражцы, мы, студэнты першага курса аддзялення журналістыкі, рашылі напісаць далёкаму сябру.

Хоць мы яшчэ недасканала ведаем нямецкую мову і, мабыць, крыху скупа расказалі аб сабе, сябры з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі нас зразумелі. Яны, як і мы, хочуць міру і дружбы. Ім, студэнтам-хімікам рабоча-сялянскага факультэта ў Патсдаме, таксама хочацца ведаць рускую мову, пазнаёміцца з нашай культурой, з жыццём нашых студэнтаў.

— Вы абавязкова пішыце нам па-руску, а мы вам — па-нямецку — піша ў гэтым жа пісьме студэнтка Інгрыд Гакбарт. — Гэта дапаможа нам лепш вывучыць рускую мову. А мы вам, у сваю чаргу, дапаможам у вывучэнні нямецкай мовы.

Гюнтэр і Інгрыд звяртаюцца таксама да нашых студэнтаў-хімікаў і біёлагаў з просьбай завязаць з імі перапіску.

Будзем спадзявацца, што разам з лістом ад журналістаў Гюнтэр і Інгрыд атрымаюць пісьмы і ад студэнтаў біялагічнага і хімічнага факультэтаў.

Т ХАРАВЕЦ.

## КОРАТКА

☆ Кандыдат філалагічных навук пісьменнік Іван Науменка прачытаў у чытальнай зале адкрытую лекцыю аб жыцці і творчасці вядомага беларускага празаіка Міхася Лынькова.

☆ У пакоі адпачынку інтэрната № 1 выкладчык тав. Кляўчэня правёў гутарку на атэістычную тэму. Ён расказаў студэнтам аб літаратурных творах, якія выкрываюць рэлігійны дурман.

☆ Адбылася нарада рэдактараў насценых газет і членаў рэдкалегій. З дакладам аб выніках работы Першага Усесаюзнага з'езду журналістаў і задачах насценнага друку выступіў намеснік дэкана філфака Р. В. Булацкі, які удзельнічаў у рабоце з'езду.

☆ На фізічным факультэце адбыўся спартыўны вечар. Тут студэнты сустрэліся з вядомымі спартсменамі, адбыліся гульні, танцы, атракцыёны.

# ГРАМАДСКІЯ НАВУКІ ТРЭБА ВЫВУЧАЦЬ ЛЕПШ

Камуністы фізічнага факультэта на чарговым сходзе абмеркавалі пытанне аб мерах паляпшэння вывучэння грамадскіх дысцыплін. Дакладчык, сакратар партыйнай арганізацыі факультэта С. А. Кісляноў, а таксама выступіўшыя ў спрэчках т.т. Халімановіч, Кірсанаў, Якуб, Андрэеў, Таель, Станкевіч і іншыя гаварылі аб тым, што не ўсе студэнты добрасумленна вывучаюць сацыяльна-эканамічныя дысцыпліны. Так, на чацвёртым курсе у канцы лістапада ў групе оптыкаў на семінарскіх занятках па палітэканоміі з 26 чалавек прысутнічала 16, прычым з іх падрытаваным да заняткаў аказаўся толькі адзін. Падобнае здараецца і на іншых курсах. Характэрна тое, што сістэматычна прапускаюць і не рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў адны і тыя ж студэнты. Напрыклад, на другім курсе з сямі семінарскіх заняткаў Дзікун і Сержановіч прапусцілі па пяць, Гатальскі і Міхневіч — па чатыры; на трэцім курсе Бадзяка — тры заняткі.

Партыйны сход патрабаваў ад камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый рашуча змагацца з парушэннямі вучэбнай дысцыпліны.

На партсходзе гаварылася і аб тым, што за пропускі заняткаў, за непаспяховасць з ліку студэнтаў фізфака былі выключаны Шлапакоў і Гаськоў. Аднак, прайшоў некаторы час, і гэтыя гультаі былі адноўлены ў ліку студэнтаў без ведама дэканата і партыйнай арганізацыі.

Партыйны сход адобрыў і рэкамендаваў распаўсюдзіць вопыт дацэнта Г. І. Якуба, які практыкуе ў групе даклады па асобных тэмах (напрыклад, па кнізе С. М. Будзённага «Пройдзены шлях», па кнізе Смірнова «Сыны» і іншых).

У выкладанні грамадскіх навук будуць выкарыстаны хранікальныя, дакументальныя і вучэбныя фільмы.

Г. КЕМБРОЎСКІ.

# ЧАСЦЕЙ ВЫСТУПАЦЬ З ЛЕКЦЫЯМІ

*10 снежня на геаграфічным факультэце адбыўся партыйны сход. Камуністы абмеркавалі пытанне аб удзеле выкладчыкаў і студэнтаў у рабоце Таварыства па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў. Дакладчык І. І. Трухан адзначыў, што многія работнікі факультэта актыўна выступаюць з лекцыямі і дакладамі перад насельніцтвам горада Мінска і рэспублікі. Гэта дацэнты В. А. Дзяменцьеў, А. Х. Шкляр, М. Т. Рамаaccount, Н. Я. Рагозін. Створана група лектараў са студэнтаў старшых курсаў. Разам з тым адзначалася, што ў рабоце Таварыства ёсць недахопы. Так, з 16 выкладчыкаў і лабарантаў факультэта ў яго рабоце прымаюць удзел толькі 9. Слабай з'яўляецца сувязь паміж Таварыствам па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў і філіялам Беларускага геаграфічнага таварыства, у якое ўваходзіць большасць выкладчыкаў геафака.*

*Партыйны сход абавязаў кожнага члена Таварыства не толькі самаму выступаць перад насельніцтвам, але і дапамагаць студэнтам у распрацоўцы лекцый. Мяркуецца ўцягнуць усіх выкладчыкаў у члены Таварыства. Сход прасіў партком дапамагчы ў арганізацыі цыкла лекцый на геаграфічныя тэмы на адным з прадпрыемстваў горада Мінска і ў падшэфным калгасе.*

В. ШАПЛЫКА

# Пісьменнікі прышлі ў інтэрнат

Нядаўна гурток беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна арганізаваў у пакоі адпачынку студэнцкага інтэрната дыспут па кнізе Тараса Хадкевіча «Даль палявая». У госці да студэнтаў прыйшлі аўтар гэтага рамана і пісьменнік Іван Науменка.

Пасля ўступнага слова, якое зрабіў Іван Науменка, пачалі выступаць студэнты. Пяцікурснік аддзялення беларускай мовы і літаратуры Фёдар Майсейшын расказаў аб сюжэце і праблематыцы рамана. Ён адзначыў, што ў «Далі палявой» добра адлюстравана жыццё вёскі і змаганне яе працаўнікоў за ўзмацненне калгаснага дабрабыту. Студэнты Іван Казак, Вячаслаў Рагойша, Наташа Палуян, Іван Абабурка гаварылі аб вобразах твора і іх тыповасці. Шэраг слушных заўваг адносна мовы рамана выказаў Варлен Бечык. Затым выступіў аўтар рамана Тарас Хадкевіч. Ён расказаў аб гісторыі стварэння рамана і сваіх творчых планах на будучае.

В. КАПЦІЛОВІЧ.

# Гучаць вершы балгарскага паэта

У клубе нашага універсітэта адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны 50-годдзю з дня нараджэння балгарскага паэта-камуніста Міколы Вапцарава.

Пасля ўступнага слова, якое зрабіў беларускі паэт Алесь Зарыцкі, кандыдат філалагічных навук дацэнт БДУ В. М. Цімафеева прачытала даклад аб жыцці і творчасці М. Вапцарава. Малады паэт Ніл Гілевіч прачытаў уласныя пераклады твораў выдатнага балгарскага паэта на беларускую мову. Вершы Міколы Вапцарава на балгарскай мове і ў перакладах прадэкламавалі студэнты універсітэта.

У заключэнне вечара прысутныя праглядзелі кінафільм «Урок гісторыі», які стварыла балгарская кінастудыя сумесна з савецкай студыяй «Масфільм».

Ц. СЦІПЛОВІЧ

# Каштоўны дапаможнік

Выдавецтва Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна выпусціла ў свет кнігу дацэнта матэматычнага факультэта Л. К. Тутаева «Геаметрыя Лабачэўскага». У кнізе пададзены кароткі пераказ асноўных палажэнняў праектыўнай геаметрыі і падрабязна распрацавана праектыўная мадэль геаметрыі Лабачэўскага. Кніга можа служыць дапаможнікам для студэнтаў, вывучаючых курс «Аснова геаметрыі».

А. ФЕДЗЕНКА.

# Сустрэча з дэпутатамі

Гэтымі днямі ў клубе БДУ са справаздачай аб сваёй дзейнасці выступілі перад выбаршчыкамі дэпутаты Ленінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных тав Трэгубаў і Жбіроўская. Прысутнымі было зададзена многа пытанняў, на ўсе былі дадзены вычарпальныя адказы.

Пасля сустрэчы адбыўся прагляд новага мастацкага кінафільма «Сонца свеціць усім».



НА ЗДЫМКУ: Тарас Хадкевіч падпісвае студэнтам аўтографы.
Фота Э. ДАМАРАЦКАГА.

# Ці варты тав. Клімовіч быць членам партыі?

**(Па слядах аднаго партыйнага сходу)**

XXI з'езд КПСС заклікаў партыйныя арганізацыі пастаянна ўдасканальваць сваю работу, выхоўваць камуністаў у духу высокай партыйнай прынцыповасці, непрымірымасці да ўсякага роду недахопаў.

Партыйная арганізацыя гістарычнага факультэта з'яўляецца адной з буйнейшых ва універсітэце і заўсёды вызначалася сваёй высокай прынцыповасцю. Партыйныя сходы факультэта, як правіла, праходзілі пры вялікай актыўнасці камуністаў, на іх рашуча выкрываліся недахопы ў вучэбна-выхаваўчай і палітыка-масавай рабоце.

Гэтага, нажаль, нельга сказаць аб партыйным сходзе, які адбыўся сёлета 10 снежня. Партсход не падтрымаў рашэння партбюро аб выключэнні з кандыдатаў у члены КПСС т. Клімовіча, які па сваіх асабістых якасцях не варты быць членам партыі.

Тав. Клімовіч уступіў у кандыдаты партыі ў кастрычніку 1957 года. У 1958 годзе ён паступіў вучыцца ў наш універсітэт.

25 снежня мінулага года т. Клімовічу быў працягнут кандыдацкі стаж, як не праявіўшаму сябе ў вучобе і грамадскім жыцці.

Як жа быў выкарыстаны гэты другі год кандыдатскага стажу?

На першым курсе ў зімовую экзаменацыйную сесію т. Клімовіч атрымаў нездавальняючую адзнаку па старажытнай рускай мове і ліквідаваў акадэмічную запазычанасць па гэтаму прадмету толькі 30 красавіка. Не падрыхтаваўшыся да летняй экзаменацыйнай сесіі, ён не здаў залік па замежнай мове. Дэканат не дапусціў яго да экзаменаў. Замест таго, каб пачаць сур'ёзна рыхтавацца, Э. В. Клімовіч самавольна паехаў дадому і адсутнічаў каля трох тыдняў. Летнюю экзаменацыйную сесію ён здаў толькі 14 верасня.

Трэба адзначыць, што па ўсіх прадметах, якія Клімовіч здаваў па некалькі разоў і амаль ніколі ва ўстаноўленыя тэрміны, ён не атрымліваў (за рэдкім выключэннем) адзнакі вышэй здавальняючай.

За дрэнную паспяховасць і парушэнні партыйнай дысцыпліны Клімовіча двойчы выклікалі ў мінулым годзе на пасяджэнні партыйнага бюро. Калі 25 снежня прайшоўшага года яму быў працягнуты кандыдацкі стаж як не праявіўшаму сябе ў вучобе і ў грамадскім жыцці, дык ужо 3 красавіка гэтага года партыйнае бюро разбірала яго за самавольны ўход з партсходу.

Партыйны сход факультэта, які адбыўся 10 красавіка бягучага года, таксама расцаніў паводзіны тав. Клімовіча як неадпавядаючыя партрабаванням Статута партыі. Аднак т. Клімовіч і на гэты раз не зрабіў ніякіх вывадаў і па-ранейшаму працягваў парушаць дысцыпліну.

Такі твар кандыдата ў члены КПСС т. Клімовіча. І ўсё ж на апошнім сходзе некаторыя камуністы (тт. Паўлючэнкаў, Самаль, Рабкоў, Ігнатовіч, Малішэўскі, Мантураў і інш.) знайшлі магчымым узяць т. Клімовіча пад сваю абарону. Так, тав. Ігнатовіч, ігнаруючы факты, заявіў, што ён гатовы даць рэкамендацыю т. Клімовічу для ўступлення ў члены КПСС. Многа гаварыў аб нялёгкім матэрыяльным становішчы Клімовіча т. Рабкоў, але ні слова не сказаў аб яго непартыйных паводзінах. Не на вышыні аказаўся і т. Васілеўскі. Сваімі рэплікамі ён усяляк імкнуўся абараніць і выгарадзіць Клімовіча, зусім не жадаючы разабрацца ў сутнасці фактаў, пададзеных у рашэнні партбюро. Выклікае глыбокае здзіўленне няправільныя пазіцыя, якую заняў на партсходзе старэйшы камуніст т. Тамашэвіч, які імкнуўся неабгрунтавана абяліць Клімовіча.

Такое становішча склалася на партсходзе таму, што некаторыя з камуністаў і самі з'яўляюцца парушальнікамі працоўнай і партыйнай дысцыпліны.

Узяць для прыкладу хоць бы т. Мантурава. Яму за пагардлівыя адносіны да калектыву загадам рэктара аб'яўлена вымова з папярэджаннем, накладзена на яго і партыйнае спагнанне—вымова.

Тав. Васілеўскі не ўдзельнічае ў грамадскім жыцці факультэта, жыве сваімі асабістымі інтарэсамі, не дапамагае студэнтам як старэйшы таварыш і як камуніст наладзіць працоўную дысцыпліну. Таму з боку студэнтаў ён не карыстаецца ніякай павагай і аўтарытэтам. Тав. Ігнатовіч таксама не можа станоўча ўплываць на сваіх таварышаў, таму што не з'яўляецца перадавіком вучобы. Камуністы тт. Рабкоў і Самаль рэдка бываюць на факультэце, не цікавяцца яго жыццём. У сілу сваёй адарванасці ад жыцця факультэта яны не ведаюць сапраўднага стану спраў на гістфаку, не ведаюць яго людзей.

Прыведзеныя факты паказваюць, што некаторая частка членаў партыйнай арганізацыі гістарычнага факультэта яшчэ не выхавала ў сябе бальшавіцкай непрымірымасці да недахопаў, ідзе на пагадненне з уласным сумленнем у тых выпадках, калі патрэбна суровая крытыка свайго таварыша па сумеснай вучобе ці рабоце. Выдатна сказаў з выпадку гэтага М. С. Хрушчоў у сваёй прамове на ліпеньскім Пленуме ЦК КПСС: «Не бойцеся сказаць праўду свайму сябру, не бойцеся! Калі вы яму скажаце праўду і калі гэта сапраўды ваш сябра, ён зразумее, что вы гаворыце яму аб гэтым, зыходзячы з прынцыповых пазіцый. Не павінна быць пагаднення з уласным сумленнем. Такія пагадненні з уласным сумленнем могуць нанесці толькі ўрон нашаму камуністычнаму будаўніцтву».

Быць аб'ектыўным, патрабавальным, прынцыповым пры рашэнні такога важнага пытання, як прыём у члены партыі, — галоўны абавязак кожнага камуніста. Абмеркаванне пытання аб уступленні ў члены партыі т. Клімовіча з усёй яснасцю паказала, што партыйная арганізацыя гістарычнага факультэта аказалася не на вышыні патрабаванняў Статута. Трэба спадзявацца, што камуністы гістфака ўлічаць гэты сур'ёзны ўрок і ў далейшым будуць строга паслядоўна праводзіць прынцыповую лінію пры рашэнні ўсіх пытанняў, якія паставіць перад імі жыццё.

Вынікі партыйнага сходу на гістарычным факультэце з новай сілай падкрэсліваюць неабходнасць узмацнення паўсядзённай работы сярод кандыдатаў у члены КПСС ва ўсіх пярвічных партарганізацыях універсітэта. Партыя павінна папаўняцца перадавымі дастойнымі людзьмі, якія з'яўляюцца прыкладам у працы і ў вучобе, у грамадскім і асабістым жыцці. У гэтым залог яе сілы, адзінства і згуртаванасці.

*Пісьмо ў рэдакцыю*

ДА ЎВАГІ ПРАФКОМА

## „СТОЙ, ПРАД'ЯВІ ПРОПУСК!"

**Гэтыя словы кідаюцца ў вочы пры ўваходзе ва ўсе чатыры інтэрнаты універсітэта. Але ніколі і нікога не затрымлівалі дзяжурныя, каб праверыць, ці мае права наведвальнік заходзіць у інтэрнат. Гэта робіцца толькі тады, калі чалавек запытае, як знайсці, дзе жыве яго знаёмы.**

**Кнігі наведванняў у інтэрнатах вядуцца ад выпадку да выпадку, хто як хоча і хто як можа. Дзяжурны замест таго, каб сачыць за парадкам, чытае літаратуру, або рыхтуецца да заняткаў. А ў інтэрнаце па вуліцы Кірава дзяжурны ператварыўся ў пасыльнага ля тэлефона.**

**Між тым, у мінулым годзе, ды і сёлета здараліся выпадкі крадзяжу ў інтэрнатах, вечарам хадзілі і ходзяць па калідорах людзі, якія не маюць ніякіх адносін нават да універсітэта.**

**Я не выпадкова не называю ніводнага прозвішча дрэнных дзяжурных па інтэрнатах, бо лягчэй было б назваць адзінкі лепшых.**

**Мне хочацца пажадаць студэнтам інтэрнатаў, каб яны як мага хутчэй навялі парадак у нясенні дзяжурстваў.**

**Л. НАЛІМАЎ.**

СПОРТ

## Калі працаваць, дык з аганьком

*За трыбунай старшыня камітэта ДТСААФ Пятро Іванчык. Ён ужо тры гады ўзначальвае факультэцкі камітэт Таварыства. Пятро добра ведае і любіць сваю работу і таму яму было аб чым расказаць у сваім дакладзе на сходзе пярвічнай арганізацыі ДТСААФ філфака.*

*За апошні год у члены ДТСААФ былі ўцягнуты амаль усе студэнты і выкладчыкі факультэта. У параўнанні з першымі гадамі арганізацыя ўзрасла больш чым у два разы (у 1958 годзе — 320 чалавек, у 1959 — 728). Многія з іх займаюцца ў абаронна-масавых гуртках. За справаздачны перыяд перавыкананы план па падрыхтоўцы матацыклістаў і шафёраў-аматараў.*

*Была прынята пастанова аб яшчэ большым узмацненні абаронна-масавай работы на факультэце.* **А. БАЗАРЭВІЧ, П. АБРАМОВІЧ, Я. ЖЫРКЕВІЧ.**

## Спартыўны вечар

*У актавай зале корпуса гуманітарных навук адбыўся спартыўны вечар універсітэта. З цікавым расказам аб набыцці спартыўнага майстэрства, аб міжнародных сустрэчах выступіла перад прысутнымі член зборнай каманды на Алімпійскіх гульнях у Мельбурне рэкардсменка свету па лёгкай атлетыцы Марыя Іткіна.*

*Член алімпійскай каманды, майстар спорту па фехтаванню Арнольд Чарнышэвіч падзяліўся сваімі ўражаннямі аб дзевяці спартыўных сустрэчах у Мельбурне, Рыме, Нью-Йорку і іншых гарадах.*

*Лепшым спартсменам універсітэта былі ўручаны на вечары падарункі і пахвальныя граматы рэктарата.* **Я. ПРАКОП'ЕЎ.**

## Пісьменнікі ў студэнтаў

Днямі універсітэт наведалі члены рэдакцыі «Литературной газеты», маскоўскія і мінскія паэты. У самай прасторнай аўдыторыі адбылася іх сустрэча з нашымі студэнтамі, супрацоўнікамі і выкладчыкамі. Аб рабоце «Литературной газеты» расказаў намеснік рэдактара В. А. Касалапаў. Затым з чытаннем сваіх вершаў выступілі паэты Бокаў, Грахоўскі, Аўрамчык і іншыя.

**К. ВЕЧАСЛАВІЧ.**

**ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ АБ МАРАЛЬНЫМ АБЛІЧЧЫ НАШАГА СУЧАСНІКА**

# Рамантыка рамантыцы розніца

ПРАЧЫТАЎ я артыкул Жаны Юшкевіч і не зразумеў, што яна хацела сказаць. Атрымліваецца, што чалавек, які разумее сімфоніі Бетховена і Баха, — гэта чалавек камуністычнага грамадства. Але, выбачайце.

Жану абураюць словы агранома: «Я лепш апладыраваў бы даярцы, надаіўшай па 12.000 літраў малака ад каровы, чым сімфоніям Бетховена і Баха». Я ж згодзен з аграномам: надаіць па 12.000 літраў малака ад каровы — гэта подзвіг, гэта мастацтва, паэзія натхняючай працы. На гэта здольны толькі чалавек з камуністычнай свядомасцю. Як жа не рукапляскаць яму, як жа не ганарыцца такім чалавекам!

Жане падобныя дасягненні здаюцца дзіцячымі, яна забывае аб тым, што на сімфоніях камунізм не пабудуеш. Не кожны чалавек разумее сімфанічную музыку, але гэта зусім не значыць, што для яго «на зямлі не існуе нічога святога».

НАША моладзь любіць рамантыку. Але рамантыка рамантыцы розніца. Некаторыя ўяўляюць сябе героямі будучага і заяўляюць, што для праяўлення гераізму патрэбны нейкія незвычайныя ўмовы, неад'емна звязаныя з нябяспекай і рызыкай. А пакуль няма падобных умоў, яны сядзяць, склаўшы рукі. Гэта не героі, такім далёка да камунізма. Сапраўдныя героі—людзі брыгад камуністычнай працы, такія, як Мікалай Мамай, Валянціна Гаганава, непакойныя цаліннікі і тысячы іншых. Што прымусіла юнакоў і дзяўчат паехаць у неабжытыя краі? Рамантыка. Але рамантыка не пустая, а карысная і патрэбная людзям, будуючым камунізм.

НЕСУМНЕННА, Жана думае, што чалавек камуністычнага грамадства павінен быць прыгожым. Некаторыя лічаць, што прыгажосць чалавека выражаецца ў яго ўчынках, другія лічаць, што, як тут не гавары, а вялікае значэнне мае і знешні выгляд.

У С. Нарыньяні ёсць фельетон «На ўсякі выпадак». Безумоўна, ён напісаны на рэальнай аснове. У ім расказваецца, што студэнт Эдзік Строкін жэніцца на Тамары Ясніковай, будучай настаўніцы. Але хутка, нібы з-за «грахоў» бацькі, ён пакідае жонку з двума дзяцьмі і зноў жэніцца.

Як можна пасля гэтага адносіцца да яго? Ці можна назваць такога чалавека прыгожым? Зразумела, не. Я лічу галоўным, што вызначае прыгажосць чалавека, з'яўляюцца не думкі яго і словы, а дзеянні.

Няправільна ў нас разумеюць іншы раз прыгажосць чалавека. Мне даводзілася назіраць за сваімі таварышамі. Ідуць яны па вуліцы, а насустрач ім — дзяўчына. Знешне яна прыгожая, апранута з густам. Хлопцы адразу звяртаюць на яе ўвагу і пачынаюць захапляцца яе «рымскім носікам» і «вочкамі з паволокай». І гэта законна. Але іншы раз за прыгожым выглядам хаваецца далёка не прывабная душа. Сярод дзяўчат універсітэта нямала з прыгожымі тварыкамі. А да вучобы не ўсе яны адносяцца добрасумленна, у грамадскай рабоце не ўдзельнічаюць. Ці можна іх лічыць прыгожымі? Па-мойму, не: не ўсё золата, што блішчыць.

БЫВАЕ і наадварот. На будоўлі універсітэта працуе многа дзяўчат, якія адразу не прыцягваюць да сябе ўвагі. Паглядзіш на твар: здаецца нічога асаблівага— і вочкі без паволокі, і носік не грэчаскі, а нават крышку кірпаты. А рабоце яна ўсю душу аддае. Міжвольна залюбуешся ёю. У імкненні рабіць людзям добрае і заключаецца прыгажосць чалавека.

Некаторыя нашы студэнты лічаць, што ў пытанні танцаў не можа быць ніякіх пэўных установак: кожны танцуе, як яму падабаецца. Але па тым ужо, як танцуе чалавек, можна меркаваць аб яго густах. Непрыемна глядзець, як выгінаецца ў танцы накшталт пытальніка студэнт першага курса аддзялення журналістыкі А. Шлег. Навошта гэтыя крыўлянні? Чаму ў нашым інтэрнаце аддаюць перавагу фокстроту, танга, чаму б не правесці развучванне бальных танцаў? Горача ўзялася спачатку за гэтую справу на словах студэнтка III курса А. Матвеева. Але на словах і спынілася яе дзейнасць.

І АПОШНЯЕ. Клімаў хоча ведаць, ці можам мы ісці ў камунізм з Барысам М. Мне здаецца, не. Барыс жыве пад мяшчанскім (ужываю азначэнне Жаны Юшкевіч) дэвізам: «Нам трэба там, дзе нас не ведаюць». Няцяжка зразумець, чаму ён прытрымліваецца гэтага «правіла». З гэтай жа мэтай ён не называе пры знаёмстве свайго сапраўднага імя і прозвішча. Не хочацца верыць, што ён можа быць сапраўдным таварышам. Чалавека, у якога кожны вечар новая знаёмая, называюць у народзе не інакш, як пырхаючы страказёл. Ці не аб такіх камсамольцах пісаў У. Маякоўскі:

Думая
о комсомоле
дни
и недели,
Ряды свои
оглядывай зорче,
Все ли комсомольцы
на самом деле,
Или
только
комсомольцев корчат?

**А. КАЗЯВІН.**

## Герой не нашага часу

*Мікалай Клімаў пытаецца ў чытачоў, ці варты Барыс жыць пры камунізме, аднак сам аб гэтым нічога не кажа. Не ведаю, як думаюць іншыя, як ацэньваюць Барыса, але кажу цвёрда: Барысу няма месца ў камунізме! Мікалай Клімаў піша, што Барыс нядрэнны чалавек. «Ён добры таварыш, гатовы апошнім падзяліцца з сябрам. Ён двойчы ездзіў на цаліну і працаваў так, што люба-дорага. ...Паедзе па прызначэнню, куды б яго ні паслалі». Многа добрага нагаварыў аўтар аб Барысе. Але няхай гэты Барыс будзе нават героем у працы і ў баі, няхай ён падарыць таварышам усе свае грошы, няхай ён едзе працаваць нават і ў Антарктыду, аднак, калі ён гэтак гаворыць аб жанчыне і не толькі гаворыць, але і робіць — значыць ён не чалавек, бо сапраўдны чалавек не можа вызначаць кошт жанчынам, як рэчы. Не можа ў камунізм увайсці чалавек з такімі поглядамі на нашых лепшых і верных спадарожнікаў жыцця.*

*Такія погляды—гэта не лыжка дзёгцю ў бочцы мёду, а наадварот, лыжка мёду ў бочцы дзёгцю. Ні граша не варты ўсе астатнія добрыя бакі барысавай душы толькі за тое, што «Барыс не прызнаваў кахання, кпіў з кожнага, хто ўздыхаў па дзяўчыне, не верыў, што можна сябраваць з імі».*

*Не, не месца Барысу ў камунізме!*

**Я. ЛЯХАЎ, Э. ЛЯХАВА.**

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19.

АТ 10847. Зак. 1923. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.